20-годдзе распаду СССР

# ЦІ МОЖНА БЫЛО ЗАХАВАЦЬ САЮЗ?

**Дваццацігоддзе падпісання Белавежскіх пагадненняў, якія паклалі канец існаванню СССР, у чарговы раз ставіць пытанне, ці можна было (а галоўнае — ці трэба было) зберагчы гэтую краіну ад распаду. Прыхільнікі немінучасці распаду абгрунтоўваюць сваё меркаванне нібыта абуральнай неэфектыўнасцю і нежыццяздольнасцю савецкай сістэмы, якая непазбежна павінна была абваліцца і пахаваць пад сваімі абломкамі краіну. Апалагеты савецкай сістэмы лічаць яе цалкам жыццяздольнай і бачаць у распадзе СССР вынік нешчаслівага збегу абставін і падрыўной дзейнасці знешніх сіл. Ісціна, як і ў большасці падобных выпадкаў, недзе пасярэдзіне.**

Разважаючы пра недахопы сацыялізму, звычайна зыходзяць з таго, што спаборніцтва сацыялістычнай і капіталістычнай сістэм праходзіла «на роўных», бо СССР з яго сатэлітамі і капіталістычны Захад валодалі роўнымі геапалітычнымі, фінансавымі, рэсурснымі і іншымі магчымасцямі. У гэтым была пераканана і сама сацыялістычная прапаганда, арыентуючы СССР на «роўную» гонку з капіталістычным блокам. Той просты факт, што СССР першапачаткова знаходзіўся ў пройгрышных у параўнанні з Захадам умовах, у аднолькавай ступені ігнаруюць як апалагеты, так і крытыкі савецкага эксперымента.

Іронія гісторыі заключаецца ў тым, што рэвалюцыйная сацыялістычная дактрына была першапачаткова арыентавана на развітыя індустрыяльныя краіны Захаду, аднак рэвалюцыя «стрэліла» ў адным з найбольш слабых звёнаў капіталістычнай сістэмы — Расіі. Гэтую супярэчнасць добра разумелі і раннія бальшавікі, разглядаючы Расію ў якасці часовага плацдарма для экспансіі сусветнай рэвалюцыі. Аднак кавалерыйскім наскокам узяць капіталістычную цытадэль не ўдалося, і СССР з часовай базы ператварыўся ў апорную краіну сацыялістычнага праекта і ўступіў у схватку «на роўных» з заходнім светам.

Аднак асноўная праблема заключалася ў тым, што да падобнай ролі Расія-СССР была катэгарычна не гатова. У 20 стагоддзе Расія ўвайшла са значна больш нізкімі стартавымі пазіцыямі, чым большасць краін Захаду, нашмат адстаючы ад іх па ўзроўні тэхналагічнага развіцця. Таму, каб вытрымліваць тэхналагічны парытэт з Захадам хоць бы ў ключавых галінах, СССР давялося прыкладаць звышнамаганні, якія выліліся ў жорсткія сацыяльныя практыкі індустрыялізацыі і калектывізацыі.

Першапачатковая тэхналагічная адсталасць была павялічана шматлікімі сацыяльнымі ўзрушэннямі, па эпічным размаху якіх Расія стала адным з сусветных лідараў. Знішчэнне эканамічнай базы і велізарныя чалавечыя страты падчас Першай сусветнай і грамадзянскай войнаў, страты і ахвяры падчас індустрыялізацыі і калектывізацыі, пабуджальным матывам для якіх стала ў тым ліку гонка з Захадам, нарэшце, чарговая хваля разбурэнняў і людскіх страт падчас Вялікай Айчыннай вайны.

Да гэтага варта дадаць, што «сацыялістычны лагер», сфарміраваны пасля Другой сусветнай вайны, быў укамплектаваны краінамі, якія ў найбольшай ступені пацярпелі ад ваенных дзеянняў, і іх аднаўленне ажыццяўлялася ў многім за кошт СССР, які ляжаў у руінах. У сваю чаргу, глабальныя канкурэнты СССР былі прадстаўлены краінамі, на тэрыторыі якіх ці ў прынцыпе не вялося баявых дзеянняў (ЗША), ці маштабы ахвяр і разбурэнняў былі несупастаўныя з савецкімі (краіны Заходняй Еўропы). Міф пра незлічоныя рэсурсныя багацці Расіі/СССР таксама аказваецца моцна перабольшаным, калі ўлічыць цяжкадаступнасць большасці радовішчаў, распрацоўка якіх была пераважна праведзена менавіта ў савецкі перыяд, а таксама тое, якія аб'ёмы рэсурсаў адцягваліся на спаборніцтва з Захадам і падкормку «саюзнікаў»-сатэлітаў.

Спаборніцтва «на роўных» з Захадам і тым больш перамога над ім былі першапачаткова непасільнымі задачамі для СССР, і славутая «неэфектыўнасць» сацыялістычнай сістэмы тут, па вялікім рахунку, ні пры чым. Наадварот, савецкую сістэму варта прызнаць дастаткова эфектыўнай. Нягледзячы на першапачаткова пройгрышныя пазіцыі, на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў СССР усё ж удалося пратрымаць у напружанні групу найбольш развітых і ўплывовых краін свету і пры гэтым дэманстраваць прыкметныя поспехі ва ўнутраным развіцці, выйсці на сусветны ўзровень развіцця ў шэрагу галін (перш за ўсё, касманаўтыка і ВПК, дзе СССР быў практычна на роўных са сваім антаганістам — ЗША). Акрамя таго, СССР зусім не быў «Верхняй Вольтай з ракетамі» і ў пасляваенны перыяд дасягнуў істотнага росту дабрабыту сваіх грамадзян. Па ўзроўні матэрыяльнай забяспечанасці грамадзян СССР так ніколі і не змог наблізіцца да заходніх узораў, такая задача была, у прынцыпе, неажыццяўляльная. Калі ўлічыць разбуральныя катаклізмы першай паловы 20 стагоддзя, а таксама тое, што насельніцтва Расіі ў той час у цэлым жыло значна больш бедна, чым насельніцтва краін Захаду, рост узроўню матэрыяльнага дабрабыту ў пасляваенным СССР ва ўмовах «халоднай вайны» будзе рабіць вялікае ўражанне.

Тым не менш, савецкая сістэма была асуджана — не столькі з-за міфічнай «неэфектыўнасці», колькі з-за непасільнасці задач, якія перад ёй сталі. Бессэнсоўнасць і бесперспектыўнасць гонкі з Захадам, а таксама стомленасць грамадства ад гэтай гонкі сталі відавочныя да 1980-х гадоў. Аднак знайсці выйсце з гэтага тупіка савецкае кіраўніцтва было не ў стане...

Існаванне СССР як пільнага крытыка капіталістычнага свету падтрымлівала апошняга ў тонусе, вымушаючы шукаць новыя рэсурсы з мэтай падтрымання ў грамадзянах упэўненасці ў перавагах гэтага ладу. Не выключана, што знікненне гэтага грознага крытыка-ворага стала адной з прычын скочвання ў сучасны крызіс. У той жа час, распад СССР не толькі дыскрэдытаваў сацыялістычную ідэю як такую, але і на дастаткова доўгі час парадзіў веру ў безальтэрнатыўнасць капіталістычнага ладу і блакіраваў развіццё якіх-небудзь альтэрнатыўных сістэм светапогляду і мадэляў светаўладкавання. Як вынік, пратэстныя настроі, якія працягвалі ўзмацняцца па меры нарастання крызісных з'яў, не здабылі належнага канцэптуальнага афармлення, застаўшыся на ўзроўні разрозненых, слаба арганізаваных успышак гвалту. Рух антыглабалізму, які з'яўляецца найбольш паслядоўным выразнікам пратэстных настрояў у сусветным маштабе, так і не змог выпрацаваць нейкай выразнай пазітыўнай праграмы, застаўшыся рухам голай крытыкі і адмаўлення, пра што сведчыць і прыстаўка «анты» ў яго назве.

**Усевалад ШЫМАЎ, кандыдат палітычных навук, дацэнт кафедры паліталогіі БДУ.**

В дополнение к объявлению от 07 декабря 2011 года газеты «Звязда», Администрация Первомайского района г. Минска сообщает, что представление экспозиционных материалов объекта жилищного строительства пройдет 19 декабря 2011 года в 18.30 в актовом зале КУП «ЖЭУ-96» по адресу:
**ул. Никифорова, 12.**

**ОАО «ГОМЕЛЬХЛЕБОПРОДУКТ»**
**ИНФОРМИРУЕТ АКЦИОНЕРОВ О ТОМ, ЧТО НА ВНЕОЧЕРЕДНОМ СОБРАНИИ АКЦИОНЕРОВ**

ОАО «Гомельхлебопродукт» 01 ноября 2011 года принято решение о реорганизации ОАО «Гомельхлебопродукт» путем выделения из его состава частного предприятия «Андреевка».

Акционеры ОАО «Гомельхлебопродукт», которые не участвовали в общем собрании акционеров или голосовали против принятия решения о реорганизации, имеют право требовать выкуп обществом принадлежащих им акций по цене 10 000 (десять тысяч) рублей за одну акцию. **Документы принимаются не позднее 30 января 2012 года по адресу: 246006, г. Гомель, ул. Мазурова, 48, отдел кадров.**

Выкуп акций ОАО «Гомельхлебопродукт» будет осуществлять на основании договоров купли-продажи акций и поручения «депо» на перевод акций обществу.

**Дополнительную информацию о выкупе акций по требованию акционеров можно получить в обществе по тел. 78 46 45.**

УНН 400010980

# БАРАЦЬБА ЗА АБІТУРЫЕНТАЎ АБВАСТРАЕЦЦА


Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

## Беларускія ВНУ вымушаны канкурыраваць ужо не толькі паміж сабой

**Убягучым годзе 60 працэнтаў выпускнікоў агульнаадукацыйных школ сталі студэнтамі ВНУ (45,2 тысячы чалавек), 19 працэнтаў (14,2 тысячы чалавек) — падоўжылі свае навучанне ў сярэдніх спецыяльных навучальных установах, і толькі 15,3 працэнта ад агульнай колькасці (усяго 11,6 тысячы чалавек) вырашылі атрымліваць прафесійна-тэхнічную адукацыю. Астатнія 4 тысячы чалавек былі або працаўладкаваныя, або прызваныя на службу ва Узброеных Сілах.**

Пры гэтым цалкам укамплектавацца сёлета не ўдалося ні ВНУ, ні ССНУ, ні прафесійна-тэхнічным навучальным установам. У вышэйшых навучальных установах засталіся незапоўненымі 337 бюджэтных месцаў, або 1 працэнт ад кантрольных лічбаў набору, з іх 134 — на дзённай форме навучання (пераважна на спецыяльнасцях педагагічнага профілю: «беларуская мова і літаратура» , «фізіка», «прафесійнае навучанне») і 203 — на завочнай. У сярэдніх спецыяльных навучальных установах не знайшлося ахвотных на 400 бюджэтных месцаў (амаль палова незапоўненых бюджэтных месцаў — на дзённай форме навучання). А ў прафтэхустановах асноўныя цяжкасці назіраліся ва ўсіх рэгіёнах пры камплектаванні груп па прафесіях лёгкай прамысловасці, машынабудаўнічага профілю, сельскагаспадарчай вытворчасці, па спецыяльнасцях «прадавец», «цясляр», «сталяр», «станочнік станкоў па дрэваапрацоўцы» і «агароднік». Невыкананне кантрольных лічбаў набору склала 3,3 тысячы чалавек, хоць прыём ва ўстановы прафтэхадукацыі быў падоўжаны да 15 верасня.

— Аптымізацыя аб'ёмаў і структуры падрыхтоўкі спецыялістаў з вышэйшай, сярэдняй спецыяльнай і прафесійна-тэхнічнай адукацыяй з'яўляецца адной з галоўных нашых задач, — падкрэсліў у сваім выступленні на калегіі, прысвечанай аналізу прайшоўшай прыёмнай кампаніі, **першы намеснік міністра адукацыі Аляксандр ЖУК.** — Асаблівую актуальнасць гэтая тэма набывае ў сувязі з трыма важнейшымі фактарамі: дынамікай рынку працы, якая абумоўлена прыярытэтным развіццём шэрагу галін эканомікі, дэмаграфічнай сітуацыяй і абвастрэннем канкурэнцыі на міжнародным рынку адукацыйных паслуг.

Па словах Аляксандра Жука, сёлета сярэднюю школу закончылі 75,5 тысячы маладых людзей, што на 12,7 тысячы чалавек менш, чым у папярэднім годзе. Колькасць выпускнікоў агульнаадукацыйных школ будзе скарачацца да 2015 года. Мяркуецца, што ў 2015 годзе выпуск складзе ўсяго каля 55 тысяч чалавек.

— Мы ўпэўнены, што пры планаванні кантрольных лічбаў прыёму кіраўнікі ўстаноў адукацыі павінны адыходзіць ад месніцкіх інтарэсаў (ад жадання зарабіць паболей грошай на прэстыжных у моладзі спецыяльнасцях) і кіравацца дзяржаўнымі інтарэсамі. **Прэстыжнымі павінны стаць тыя спецыяльнасці, якія патрэбны эканоміцы і дзе чакаюць маладых спецыялістаў,** — падкрэсліў Аляксандр Жук.

Аднак у моладзі склалася свае ўяўленне аб прэстыжнасці тых ці іншых спецыяльнасцяў, і пакуль што ніякія довады пра рэальныя патрэбы рынку працы і перспектывы працаўладкавання на маладых людзей не дзейнічаюць. Так, у лістападзе гэтага года спецыялісты Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы правялі апытанне сярод вучняў выпускных класаў для выяўлення матываў, якімі кіруюцца абітурыенты пры выбары спецыяльнасці. Усяго апытаннем былі ахоплены 4,5 тысячы выпускнікоў школ Гродзеншчыны. Больш як 80 працэнтаў выпускнікоў паведамілі, што асноўны фактар пры выбары спецыяльнасці для іх — гэта інтарэс да канкрэтнай спецыяльнасці. Аднак для большай паловы старшакласнікаў важнейшае значэнне мае прэстыжнасць спецыяльнасці. Пры гэтым прэстыжнасць спецыяльнасці ў большай ступені хвалюе тых, хто плануе атрымліваць адукацыю на дзённай форме навучання (53 працэнты). Сярод тых, хто нацэлены на завочную форму навучання, на прэстыжнасць указала толькі 40 працэнтаў рэспандэнтаў. Першыя радкі ў рэйтынгу спецыяльнасцяў у будучых абітурыентаў займаюць эканамічныя, медыцынскія, юрыдычныя і інжынерныя спецыяльнасці.

Цікава, што толькі 7 працэнтаў выпускнікоў звязваюць свой выбар з даступным коштам навучання. Кожны восьмы рэспандэнт плануе навучацца на платнай аснове. **І 42 працэнты выпускнікоў адзначылі, што ў сітуацыі выбару (не прэстыжна, затое навучанне на бюджэце ці прэстыжна, але навучанне на платнай аснове) яны аддадуць перавагу навучанню на прэстыжнай спецыяльнасці, няхай і за ўласныя сродкі.** 54 працэнты ахопленых апытаннем выпускнікоў паведамілі, што плануюць паступаць у сталічныя ВНУ, больш як 6 працэнтаў — у ВНУ Польшчы, Расійскай Федэрацыі, Літвы і іншых краін.

— Хацелася б звярнуць увагу на шэраг праблем, якія маюць сістэмны характар і патрабуюць сістэмных рашэнняў, — узяў слова **прарэктар па вучэбнай рабоце і кіраванню якасцю Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы Юрый БЯЛЫХ**. — Ва ўмовах скарачэння агульнай колькасці ў краіне абітурыентаў і прывабнасці навучання ў Мінску сталічныя ВНУ аказваюцца заведама ў больш выгадным становішчы. «Дэмаграфічная яма» стала ў большай ступені праблемай рэгіёнаў. Гэта патрабуе павышанай увагі да рэгіянальных ВНУ як да асноўных крыніц кадравага патэнцыялу рэгіёнаў. Для прыкладу, амаль увесь склад гродзенскай рэгіянальнай мытні сфарміраваны з выпускнікоў нашага ўніверсітэта. Першы выпуск інжынераў-будаўнікоў змог задаволіць толькі трэцюю частку заявак арганізацый. Імкненне нашага ўніверсітэта адпавядаць патрабаванням рынку працы рэгіёна прывяло да таго, што за апошняе дзесяцігоддзе ўнутры яго фактычна сфарміравалася новая тэхнічная ВНУ з чатырнаццаццю спецыяльнасцямі. Аднак такі якасны рост універсітэта не быў падтрыманы павелічэннем колькасці бюджэтных месцаў, і мы былі вымушаны забіраць месцы з іншых спецыяльнасцяў, змяншаць лічбы бюджэтнага набору там фактычна да некалькіх адзінак пры вялікай цікавасці да іх з боку моладзі. Мы клапоцімся аб змесце навучання, але не надаём належнай увагі назвам спецыяльнасцяў, не клапоцімся пра «прыгожую ўпакоўку» для нашых адукацыйных паслуг.

> **42 працэнты выпускнікоў адзначылі, што ў сітуацыі выбару (не прэстыжна, затое навучанне на бюджэце, ці прэстыжна, але навучанне на платнай аснове) яны аддадуць перавагу навучанню на прэстыжнай спецыяльнасці, няхай і за ўласныя сродкі...**

Пры гэтым беларускія ВНУ вымушаны канкурыраваць сёння не толькі паміж сабой, але і з замежнымі ВНУ. Прычым **барацьба ідзе ўжо не толькі за прыцягненне да нас студэнтаў-замежнікаў, але і за ўтрыманне на радзіме выпускнікоў беларускіх школ.** Замежныя ВНУ вельмі агрэсіўныя ў сваёй маркетынгавай дзейнасці: яны прапануюць для беларусаў бясплатныя экскурсійныя адукацыйныя туры, завабліваюць месцам у кампусе, бясплатным навучаннем і стыпендыяльнай падтрымкай. У літоўскіх ВНУ адкрываюцца рускамоўныя групы. А расійскія ВНУ, размешчаныя ў раёнах, што мяжуюць з нашай краінай, фарміруюць асобныя патокі для навучання беларускіх грамадзян.

Аляксандр Жук расказаў, што за апошнія гады прыём у дзяржаўных ВНУ на высокатэхналагічныя спецыяльнасці, якія забяспечваюць кадравыя патрэбы інавацыйнай вытворчасці, быў істотна павялічаны: па профілю «тэхніка і тэхналогіі» — на 3,4 тысячы чалавек (або на 20 працэнтаў), на «прыродазнаўчыя навукі» — амаль на 900 чалавек (36 працэнтаў), «архітэктура і будаўніцтва» — на 1,2 тысячы (36 працэнтаў). Сёлета на спецыяльнасці, звязаныя з падрыхтоўкай кадраў для «новай» эканомікі (нана-, бія-, ІТ-тэхналогіі) было залічана 1,7 тысячы чалавек. А вось па такіх напрамках, як «эканоміка», «кіраванне», на гуманітарных і юрыдычных спецыяльнасцях набор, наадварот, скарачаўся. У 2011 годзе дадаткова быў скарочаны прыём на юрыдычныя спецыяльнасці на 12 працэнтаў (або на 245 бюджэтных месцаў), на эканамічныя спецыяльнасці — на 7 працэнтаў (або на 142 бюджэтныя месцы), на педагагічныя спецыяльнасці — на 5 працэнтаў (на 204 бюджэтныя месцы) і гуманітарныя спецыяльнасці — на 5 працэнтаў (або на 54 бюджэтных месцы). Прыём на юрыдычныя спецыяльнасці ў грамадзянскіх ВНУ складае ўсяго 303 чалавекі — гэта менш як 1 працэнт ад агульнага набору. Асноўная падрыхтоўка юрыстаў ажыццяўляецца зараз ва ўстановах адукацыі Міністэрства ўнутраных спраў: Акадэміі МУС і Магілёўскім вышэйшым каледжы. У 2011 годзе ў гэтыя ВНУ было залічана 592 чалавекі.

> **Замежныя ВНУ вельмі агрэсіўныя ў сваёй маркетынгавай дзейнасці: яны прапануюць для беларусаў бясплатныя экскурсійныя адукацыйныя туры, завабліваюць месцам у кампусе, бясплатным навучаннем і стыпендыяльнай падтрымкай...**

Падчас правядзення ўступнай кампаніі 2012 года ў беларускіх ВНУ плануецца захаваць бюджэтныя месцы практычна на ўзроўні 2011 года. А вось пры распрацоўцы прагнозных лічбаў прыёму ў ССНУ прадугледжана скарачэнне плана прыёму на навучанне за кошт сродкаў бюджэту па незапатрабаваных арганізацыямі-заказчыкамі спецыяльнасцях — там, дзе колькасць заявак меншая за 80 працэнтаў. Скарачэнне закране таксама набор на спецыяльнасці, дзе размеркаванне выпускнікоў з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй ажыццяўляецца на пасады рабочых ніжэй за 4 кваліфікацыйны разрад.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# Навукоўцы рыхтуюцца адзначыць 90-годдзе Інбелкульта

**МІЖНАРОДНАЯ канферэнцыя, прысвечаная 90-годдзю стварэння Інстытута беларускай культуры, прайшла 8-9 снежня ў Нацыянальнай акадэміі навук. У ёй удзельнічалі навукоўцы не толькі з розных гарадоў Беларусі, але і з расійскіх гарадоў — Масквы, Самары і Навасібірска.**

— Навуковая думка Беларусі мае глыбокія карані. Яе вытокі — у глыбіні стагоддзяў. Зараджэнне элементаў навуковых ведаў і паданняў непарыўна звязана з гісторыяй фарміравання беларускага грамадства. Развіццё навукі вызначалася не толькі логікай руху навуковых ідэй, але, галоўным чынам, самім жыццём, пануючымі рэлігійнымі, філасофскімі, ідэалагічнымі плынямі і палітычнымі адносінамі, — адзначыў у сваім выступленні **Аляксандр КАВАЛЕНЯ, акадэмік-сакратар Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў НАН Беларусі, доктар гістарычных навук, прафесар.** — Вызначальнымі падзеямі ў навуковым жыцці Беларусі стала адкрыццё ў 1921 годзе Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта і заснаванне ў 1922 годзе буйнога навукова-даследчага цэнтра — Інстытута беларускай культуры, які стаў правобразам будучай беларускай Акадэміі навук.

Нагадаем, яшчэ ў лютым 1921 года пры Наркамаце асветы БССР была створана Навукова-тэрміналагічная камісія, у задачы якой уваходзіла распрацоўка навуковай тэрміналогіі на беларускай мове. Паралельна рыхтаваўся статут навукова-даследчай установы, які быў гатовы да лістапада. А 30 студзеня 1922 года на базе Навукова-тэрміналагічнай камісіі быў утвораны Інстытут беларускай культуры. Яго першым старшынёй стаў Сцяпан Некрашэвіч.

Як адзначыў у сваім выступленні **Уладзімір АДАМУШКА, дырэктар Дэпартамента па архівах і справаводстве Міністэрства юстыцыі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт,** навукоўцы Інбелкульта аддавалі шмат сіл для таго, каб захаваць культурную спадчыну Беларусі:

— Інбелкультам збіраліся, апісваліся і захоўваліся ўнікальныя рукапісы беларускай літаратуры XIX стагоддзя, асабістыя архівы Максіма Багдановіча, Паўлюка Труса, збор кніг і дакументаў Браніслава Эпімах-Шыпілы. Усё гэта патрабавала вялізных маральных і духоўных затрат. Тым не менш, Інстытутам беларускай культуры вялася актыўная праца па пошуку рукапісаў, было напісана вялізная колькасць лістоў нашчадкам і ўладальнікам, арганізоўваліся экспедыцыі, шырока выкарыстоўвалася прэса. Прыкладам незвычайнай аператыўнасці можа паслужыць артыкул Язэпа Дрылы «Знойдзеныя скарбы» ў адной з газет за 21 красавіка 1923 года. У ім аўтар ужо на другі дзень пасля падзеі віншуе працоўных Беларусі са шчаслівым для беларускай культуры днём набыцця асабістага архіва Максіма Багдановіча...

На пленарным пасяджэнні таксама выступіла **Таццяна ПЛАТОНАВА, прадстаўнік Політэхнічнага музея Масквы** — яна павіншавала беларускіх навукоўцаў з юбілеем і падарыла Нацыянальнай акадэміі навук кнігі, выдадзеныя за апошні час іх музеем.

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

**Извещение о проведении открытого аукциона по продаже объектов недвижимого имущества, находящегося на праве собственности ОАО «Лавсанстрой» 10.01.2012**

| | Лот № 1 | Лот № 2 | Лот № 3 |
|---|---|---|---|
| **Предмет открытого аукциона** | Трехэтажное кирпичное здание склада битумных мастик БАБЗ | Одноэтажное крупнопанельное здание склада лесоматериалов БАБЗ | Трехэтажное каменное здание котельной БАБЗ с подвалом |
| **Место нахождения недвижимого имущества** | Могилевская обл., Могилевский р-н, Кадинский с/с, 6 | Могилевская обл., Могилевский р-н, Кадинский с/с, 7 | Могилевская обл., Могилевский р-н, Кадинский с/с, 5 |
| **Начальная цена предмета открытого аукциона без учета НДС, рублей** | 153 000 000 | 247 000 000 | 341 400 000 |
| **Сумма задатка, рублей** | 3 060 000 | 4 940 000 | 6 828 000 |
| **Продавец недвижимого имущества** | Открытое акционерное общество «Лавсанстрой». Контактные телефоны: 8 (0222) 48 42 83, 48 56 17, факс 48 82 68 | | |
| **Характеристика объектов недвижимого имущества** | Общая площадь здания – 224 м². Объем – 1193 куб.м. Фундамент – ж/бетонный, стены – кирпичные, крыша – рулонная совмещенная, полы – бетонные. Год постройки 1977. | Общая площадь здания – 360 м². Объем – 1944 куб.м. Фундамент – ж/бетонный, стены – ж/бетонные панели, крыша – рулонная совмещенная, полы – бетонные. Год постройки 1987. | Общая площадь здания – 560,2 м². Объем – 5419 куб.м. Фундамент – ж/бетонный; стены – крупнопанельные, кирпичные; крыша – рулонная совмещенная; полы – бетонные. Год постройки 1971. |
| **Информация о земельном участке для обслуживания недвижимого имущества** | Площадь земельного участка – 0,3543 га. Кадастровый номер: 724400000001000807. | Площадь земельного участка – 0,0474 га. Кадастровый номер: 724400000001000833. | Площадь земельного участка – 0,1788 га. Кадастровый номер: 724400000001000831 |

1. Открытый аукцион состоится **«10» января 2012 г. в 14.00** по адресу: г. Могилев, б. Непокоренных, 28.

2. Организатор открытого аукциона – Открытое акционерное общество «Лавсанстрой, 212002, г. Могилев, б. Непокренных, 28, тел.: (8 0222) 48 42 83, 48 56 17.

3. Заявления на участие в открытом аукционе принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: г. Могилев, б.Непокоренных, 28, юридический сектор, 2-ой этаж, тел. 8 (0222) 48 56 17.

4. Последний день подачи заявлений на участие в открытом аукционе – **«9» января 2012 г. до 17.00**.

5. Заключительная регистрация участников открытого аукциона «10» января 2012 г. с 8.00 до 13.00.

6. Открытый аукцион проводится без условий.

7. Текущий (расчетный) счет ОАО «Лавсанстрой» № 3012119248027 в Региональной дирекции № 600 ОАО «БПС-Сбербанк», код 369, УНП 700010300. Задаток для участия в открытом аукционе.

8. Для участия в открытом аукционе подается заявление с приложением следующих документов:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка;

индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – свидетельство о государственной регистрации;

юридическим лицом Республики Беларусь – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица;

иностранным юридическим лицом, иностранной организацией, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств, иностранным государством и их административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организацией – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов, выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на русский или белорусский язык;

представителем иностранного инвестора – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности иностранного инвестора, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на русский или белорусский язык;

представителем гражданина Республики Беларусь, в том числе индивидуального предпринимателя, – доверенность.

При подаче документов на участие в открытом аукционе граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, физические лица (граждане Республики Беларусь и лица без гражданства), постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, представители иностранных инвесторов предъявляют документ, удостоверяющий личность.

9. Организатор открытого аукциона имеет право снять предмет открытого аукциона в любое время, но не позднее чем за три календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором открытого аукциона извещаются участники аукциона.

10. Победитель открытого аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Наибольшая цена фиксируется в протоколе о результатах открытого аукциона и не включает НДС. Открытый аукцион признается несостоявшимся, если заявление на участие подано менее чем двумя участниками. Предмет открытого аукциона не может быть продан по начальной цене. В случае, если открытый аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет открытого аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5%.

11. Договор купли-продажи объекта недвижимого имущества заключается с победителем открытого аукциона в течение 10 рабочих дней с даты подписания протокола о результатах открытого аукциона.

12. До подписания договора купли-продажи победитель открытого аукциона (претендент на покупку) обязан возместить затраты на организацию и проведение открытого аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения.

13. Оплата стоимости приобретенного на открытом аукционе недвижимого имущества осуществляется в установленном порядке за белорусские рубли в соответствии с договором купли-продажи. Условия оплаты – разовый платеж.

**г. ВИТЕБСК** **19.12.2011**

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПОВТОРНОМ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ ГОСУДАРСТВЕННОЙ СОБСТВЕННОСТИ С УСТАНОВЛЕНИЕМ НАЧАЛЬНОЙ ЦЕНЫ ПРОДАЖИ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА, РАВНОЙ ОДНОЙ БАЗОВОЙ ВЕЛИЧИНЕ**

| № лота | Наименование предмета аукциона | Характеристика предмета аукциона | Начальная цена продажи предмета аукциона, рублей | Сумма задатка, рублей |
|---|---|---|---|---|
| 6. | Здание бани с холодной пристройкой, расположенное по адресу: Витебская область, Полоцкий район, д. Малое Ситно | Характеристика объекта недвижимости: капитальное строение с инвентарным номером 250/С-31162 (здание бани с холодной пристройкой), одноэтажное кирпичное, фундамент – бетонный, а/ц листы по деревянным стропилам общей площадью 84 кв.м. Земельный участок: с кадастровым номером 223883803101000020 площадью 0,0325 га для содержания и обслуживания недвижимого имущества, сроком аренды 50 лет. Назначение – для размещения объектов: административно-хозяйственного назначения, розничной торговли, общественного питания, гостиничного назначения, физкультурно-оздоровительного и спортивного назначения, культурно-просветительского и зрелищного назначения, бытового обслуживания населения. | Одна базовая величина | Одна базовая величина |
| 7. | Здание клуба, расположенное по адресу: Витебская область, Оршанский район, Клюковский с/с, д. Софиевка, д. 29 | Характеристика объекта недвижимости: капитальное строение с инв. № 240/С-30337 (сооружение специализированное культурно-просветительного и зрелищного назначения), бревенчатое одноэтажное, 1969 г.п., общ. площадь 94,4 кв.м, объем 371 куб.м, фундамент бетонный, перекрытие деревянное, крыша шиферная. Земельный участок: с кадастровым номером 223682706101000025 для содержания и обслуживания клуба, площадь 0,0222 га. Использование – для специализированного культурно-просветительного и зрелищного назначения. | Одна базовая величина | Одна базовая величина |

**ОРГАНИЗАТОР – фонд «Витебскоблимущество», г. Витебск, ул. «Правды», 38, контактный телефон в Витебске: (0212) 476096, сайт www.gki.gov.by, www.fondgosim.vitebsk.by, e-mail:votfondgi@tut.by.**

ПРОДАВЕЦ ОБЪЕКТОВ НЕДВИЖИМОСТИ: Белорусский производственно-торговый концерн лесной, деревообрабатывающей и целлюлозно-бумажной промышленности, контактный телефон в г. Минске (017) 227 52 54.

**Условия продажи недвижимого имущества:**

**по лотам №№ 1, 2** – осуществление покупателем предпринимательской деятельности на данных объектах, создание им дополнительных рабочих мест; запрещение покупателю продажи, иного отчуждения объектов до выполнения им условий договора купли-продажи.

**Условия предоставления земельных участков:**

**по лоту № 1** – получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения исполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработку строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий 2 лет (в случае изменения назначения недвижимого имущества); осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией (в случае изменения назначения недвижимого имущества);

**по лоту № 2** – заключение победителем аукциона с Клюковским сельисполкомом договора аренды земельного участка и осуществление в двухмесячный срок, после принятия решения райисполкома о предоставлении ему земельного участка, государственной регистрации права на земельный участок; получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на строительство (реконструкцию) объекта в срок, не превышающий двух лет; осуществление строительства (реконструкции) объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией.

**Аукцион состоится 19.12.2011 в 15 часов в здании фонда «Витебскоблимущество» по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 38.**

1. Для участия в аукционе приглашаются негосударственные юридические лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, иностранные инвесторы. Участнику необходимо подать заявление и подписать Соглашение установленной формы с фондом «Витебскоблимущество».

Лица, желающие принять участие в аукционе, к заявлению прилагают: заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; а также представляются: негосударственным юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования и подлинник этого документа для проверки его соответствия копии; иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть оформлена не ранее чем за шесть месяцев до даты подачи заявления) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия.

Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00, **последний день приема документов 16.12.2011 до 17.00** по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 38, кабинет 308. **Заключительная регистрация участников 19.12.2011 с 14.00 до 15.00**. К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

2. Сумма задатка перечисляется до подачи заявления на участие в аукционе на расчетный счет № 3642903027026 в Региональной дирекции № 200 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369. Получатель – фонд «Витебскоблимущество», УНП 300002495.

3. Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже неиспользуемого имущества, находящегося в республиканской собственности, с установлением начальной цены продажи, равной одной базовой величине, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 11.03.2010 № 342. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Аукцион признается несостоявшимся, если заявление на участие подано менее чем двумя участниками, предмет аукциона не может быть продан по начальной цене. В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

4. Организатор аукциона вправе отказаться от проведение аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты его проведения.

**5. Участник, ставший победителем аукциона (претендентом на покупку), после окончания аукциона обязан:** подписать протокол аукциона; **не позднее 10 рабочих дней** со дня принятия решения исполкома о предоставлении ему земельного участка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, и расходы, связанные с формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении этого участка; **не позднее 12 рабочих дней** со дня принятия решения о предоставлении земельного участка заключить договор купли-продажи недвижимости и договор аренды земельного участка.

6. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектами продажи.

7. Информация о проведении аукционов была опубликована ранее в газетах «Звязда» от 26 января 2011 г. № 15, от 15 марта 2011 г. № 47, от 29 апреля 2011 г. № 80, от 11 июня 2011 № 108, от 14 июля 2011 № 131, от 08 сентября 2011 № 171 (27035), от 26 октября 2011 № 204 (27068).

Працяг тэмы

# ПРЫЗНАЦЬ ЗАБРУДЖАНАЕ НАСЕННЕ МАКУ — НАРКОТЫКАМ!

## ПОГЛЯД ПСІХІЯТРА-НАРКОЛАГА

**Пасля выхаду на старонках «Звязды» журналісцкага расследавання пра самы папулярны ін'екцыйны наркотык у краіне аўтарытэтныя людзі пачалі прапаноўваць захады, як спыніць небяспеку. Колькасць наркаспажыўцоў расце, а «бубкі» нескладана набыць на рынках і праз наркатаксі. Яшчэ лягчэй прыгатаваць з гэтай сыравіны наркатычны раствор.**
**Днямі ў рэдакцыю патэлефанаваў вядомы гродзенскі псіхіятр-нарколаг Віктар Кузняцоў. Ён біў трывогу з 2005 года, калі ўнікальны наркотык з'явіўся на беларускім рынку. Непасрэдна даследаваў спажыўцоў забруджанага маку і вывучаў, з дапамогай якога феномена наркадылеры так доўга і амаль беспакарана насаджаюць беларусам смерць.**



1991 год. Сустрэча з Папам Рымскім Янам Паўлам Другім.

**Віктар Сцяпанавіч КУЗНЯЦОЎ**

**Урач псіхіятр-нарколаг.
З 1987 па 2003 год узначальваў Гродзенскі псіханеўралагічны дыспансэр.
У 1991 годзе быў запрошаны ў Ватыкан, дзе меў асабістую сустрэчу з Папам Рымскім Янам Паўлам ІІ. Гутарка тычылася пабудовы новага корпуса псіханеўралагічнага дыспансэра ў Гродне. Папа Рымскі паабяцаў за гэта маліцца.
Працоўны стаж Віктара Сцяпанавіча большы за 30 гадоў.**




### Што дае наркатычны эфект?

*Віктар Сцяпанавіч дасціпна тлумачыць прыродны феномен, які дазваляе вырабляць з забруджанага насення маку наркатычны раствор. Менавіта на гэты феномен наркадылеры і зрабілі стаўку.*

— Макавае зернетка па азначэнні не змяшчае наркотык. І гэта догма! У той жа час наркагандляры выкарыстоўваюць насенне як носьбіт, з дапамогай якога наркотык пераносіцца, — кажа Віктар Кузняцоў. — Алкалоіды ўтрымліваюцца ў макавым малацэ. Гэта тое, што абараняе расліну ад шкоднікаў і дазваляе ёй выспяваць.

Як толькі мак выспявае, малако, якое па сасудах сілкавала расліну, засыхае і застаецца ў галоўцы і сцяблінах. Усе сувязі-нітачкі адміраюць, і само насенне робіцца чыстым. Прыродны феномен.

Гэтак жа няма наркотыку і ў насенні канопляў (марыхуаны). Таму што гэта семечка, у ёй усё самае найлепшае для новага жыцця.

Але я бачыў, як выглядае забруджаны мак, з якога наркаманы «вараць» раствор. Сыравіна дрэннай якасці. Натуральна, наркотык туды наўмысна дамяшаны. Таму што сучасныя сельскагаспадарчыя машыны, якія праводзяць першасную падрыхтоўку зерня (веялкі, сушылкі і гэтак далей) зроблены так граматна, што на вока забруджанасць пабачыць немагчыма. А калі забруджаны мак, які спажываюць наркаманы, кінуць у ваду, то насенне намакае і тоне, а салома застаецца наверсе. Гэтая макавая салома падчас «варкі» дае наркатычны эфект. Наркаспажыўцы пацвярджалі, што калі мак прамыць звычайнай вадой, ён робіцца «беспантовым», то бок не дае эфекту. Таму што арганічныя дамешкі прыбіраюцца.

**— Падчас журналісцкага эксперыменту мы закупілі «бубкі» з дамешкамі макавай саломы. Але была закупка і такіх «бубак», калі дамешкаў не было. Мак выглядаў амаль як харчовы. Але з такой сыравіны наркаспажыўцы таксама «варацца» і колюцца. Што дае эфект, калі няма саломы?**

— Гэта яшчэ адзін момант, на які трэба звярнуць увагу. Хутчэй за ўсё робіцца імпрэгнацыя кадэіну і тэбаіну ў макавае насенне, насычэнне. Як гэта можа адбывацца? Напрыклад, макавае насенне з'яўляецца адходам вытворчасці гераіну ў Афганістане. Яго ж таксама трэба неяк прадаваць...

Для гераіну каштоўны марфін. Застаюцца алкалоіды кадэін і тэбаін. Такім чынам, у насенне маку могуць рабіць імпрэгнацыю кадэіну і тэбаіну.

Эфект, які атрымліваюць наркаспажыўцы з раствору, уласцівы кадэіну. Гэта так званы наркотык другога гатунку. Яму ўласцівы разрыўны эфект: колікі бегаюць па ўсім целе, усё пачынае свярбець, хочацца ўвесь час нешта кранаць, мяць. Самае страшнае, што «шырка», прыгатаваная з такога маку, у наркаспажыўцоў са стажам з першай дозы не выклікае так званага «прыходу». Таму, каб спакойна пражыць дзень, яны робяць некалькі ін'екцый, і эфект дасягаецца толькі на трэцюю-чацвёртую. Гэтая ўласцівасць штурхае наркамана шукаць чарговую дозу, часта парушаючы пры гэтым закон.

### Чаму наркаспажывец кайф атрымлівае, а ў лабараторыях наркотык не знаходзяць?

**— Якія захады, на вашу думку, маглі б прыпыніць пастаўкі «бубак» у краіну?**

— Найперш трэба сканцэнтраваць увагу на наяўнасці наркатычных рэчываў у субстраце, якім з'яўляецца забруджанае насенне маку.

**— Гэта значыць, прызнаць «бубкі» наркотыкам. Але наша журналісцкае расследаванне паказала, што сённяшняя методыка даследавання не дазваляе знайсці ў забруджаным насенні алкоіды опію. Прынамсі, калі няма відавочных дамешкаў макавай саломы. Наркаспажыўцу хапае 250 грамаў, каб «умазацца», а экспертыза наяўнасць наркотыку не канстатуе.**

— У крыміналістычных лабараторыях даследавалі экстракцыйны опій, які наркаманы атрымлівалі з забруджанага насення. І наяўнасць наркотыку хутка і без пытанняў вызначалі. Часам міліцыя затрымлівала спажыўцоў на стадыі садацыі. Гэта першы этап прыгатавання наркатычнага раствору, калі насенне змешваецца са звычайнай пітной содай. Робіцца гэта для таго, каб разрыхліць субстрат, і наркотык лепш вылучаўся. Дык вось, нават з этапа садацыі алкалоіды ўжо вылучаюцца.

Што тычыцца методык даследавання забруджанага насення. Я маю здагадкі, што тэхналогіі прапісаны пэўнымі канонамі, калі наркотык спрабуюць знайсці ў макавым насенні, дзе яго быць не можа.

Неабходна рабіць экстракцыю з пэўнай колькасці насення, каб зразумець, ёсць там наркотык ці не.

Гэта недасканаласць методыкі, ад якой эксперты не маюць права адступіць.

Ніхто не замінае змяніць сітуацыю і ўзяць на ўзбраенне методыку таго ж наркаспажыўца. Каб вылучыць наркотык, якасна і колькасна яго аналізаваць. Забруджанае насенне маку, якое прадаецца нелегальна, каштуе ў некалькі разоў даражэй, чым звычайны харчовы мак з супермаркета. У 250 грамах бруднага маку змяшчаецца не менш за адну дозу сумесі класічных наркотыкаў. Дык якія цяжкасці могуць быць з выяўленнем?

### «Прывёз забруджаны мак — сядай у турму»

**— Выказваецца ідэя дзяржманаполіі на пастаўкі маку. Што вы пра гэта думаеце?**

— Я лічу, што гэта не вырашыць праблемы. Спатрэбяцца велізарныя рэсурсы, каб кантраляваць дзяржманаполію. І шанц карупцыі на парадак павялічыцца.

Да таго ж учорашні наркатаксіст можа закупіць звычайны харчовы мак. Потым, рызыкуючы, купіць саломы, прапусціць яе праз блендар і змяшаць з гэтым насеннем. На гэтым этапе яму зноў не пагражае крымінальная адказнасць. Забруджанае насенне ён зможа прадаваць пад выглядам харчовага маку і ў выпадку чаго сплочваць штрафы за незаконную прадпрымальніцкую дзейнасць.

Яшчэ раз падкрэслю, што пытанне трэба ставіць аб наяўнасці наркатычнага рэчыва ў субстраце. У дадзеным выпадку гэта насенне маку.

Што зараз робяць у некаторых рэгіёнах Расіі? Знаходзяць партыю забруджанага маку, даследуюць яе на наяўнасць наркотыкаў і без пытанняў даюць турэмныя тэрміны. Іх методыкі даследавання дазваляюць выяўляць наркотык.

Важна патлумачыць людзям праз сродкі масавай інфармацыі, што наркотыку ў насенні маку няма! Наркотыкі абавязкова штучна дамешваюцца. Альбо гэта макавая салома, альбо адходы буйнамаштабнай гераінавай вытворчасці.

Усіх гандляроў макам трэба папярэдзіць, што іх павінен цікавіць не толькі дзяржаўны стандарт, але і наркатычная чысціня. Прывёз забруджаны мак — сядай у турму. Вы напісалі ў расследаванні, што мытнікі затрымалі дзве фуры з забруджаным макам на мяжы з Літвой. Здавалася б, бяскрыўдны мак правозіўся пад выглядам садавіны і гародніны. Кіроўца сам сябе прадае. Ён падманваў наконт тавару — значыць ведаў, што вязе забруджаны мак. За гэта трэба жорстка караць.

Чаму насенне маку прадаюць наркаманам у чорных пакеціках? Людзі сваімі дзеяннямі паказваюць, што займаюцца крыміналам. Але яны ведаюць, што больш чым штрафам іх не пакараюць. А павінны быць рэальныя турэмныя тэрміны, буйныя канфіскацыі. Тады гэты «від спорту» зробіцца нерэнтабельным.

Трэба рыхтавацца і да таго, што ўсё роўна пачнецца мітусня. Ажывуць канкурэнты, якія могуць пастаўляць, напрыклад, гераін.

Тым не менш вырашаць праблему з «бубкамі» неабходна тэрмінова. Наркаманы пачынаюць у літаральным сэнсе блытацца пад нагамі.

**P.S.** *Нагадаем, што пасля выхаду журналісцкага расследавання «Звязды» «З-за чаго пастаўкі наркатычнага маку ў Беларусь не могуць спыніць?» мы атрымалі шмат тэлефанаванняў ад чытачоў, якія выказалі свае крытычныя думкі. Таксама праблема шырока абмяркоўвалася на шэрагу інтэрнэт-форумаў.*

*Вядома, адгукнуліся і прадстаўнікі ўлады.*

*Дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Зінаіда Мандроўская выказала свой пункт гледжання на тое, як паставіць заслон «бубачнай» небяспецы:*

- ✓ *Удасканаліць методыкі даследавання забруджанага насення маку.*
- ✓ *Увесці дзяржманаполію на пастаўкі маку альбо выдаць ліцэнзіі дзвюм буйным арганізацыям, каб завоз харчовага маку ў краіну можна было татальна кантраляваць.*
- ✓ *Дабіцца ўзаемадзеяння ўсіх ведамстваў дзеля супрацьдзеяння небяспецы.*
- ✓ *Праводзіць граматную антынаркатычную прафілактыку ў школах, з прыцягваннем найлепшых псіхолагаў, з выкарыстаннем досведу перадавых краін.*

*Некаторыя аўтарытэтныя міліцэйскія чыноўнікі падкрэслілі, што важна патлумачыць беларускім чыноўнікам сутнасць праблемы, бо не ўсе адказныя людзі яе разумеюць. Таксама ёсць прапановы ўвесці жорсткія канфіскацыі маёмасці за гандаль забруджаным макам.*

**Яўген ВАЛОШЫН.**

## РОЗДУМ ПІСЬМЕННІКА

# «ТОЛЬКІ СЭРЦАМ ТРЫВОЖНЫМ ПАЧУЮ...»

**НЯДАЎНА ў выхадны дзень, шчоўкаючы пультам тэлевізара, натрапіў на праграму, прысвечаную песням Уладзіміра Высоцкага. Зноў ускалыхнулі душу славутыя «Кони привередливые», «Протопи ты мне баньку», «Порвали парус»...**

Песні спявалі сучасныя выканаўцы. У студыі з аднаго боку сядзелі тыя, хто ведаў і любіў Уладзіміра Сямёнавіча, з другога — прадстаўнікі маладога пакалення.

Кожны меў магчымасць выказацца пра песні, пра асобу творцы. І трэба сказаць, што думкі, ацэнкі пачутага і ў маладых, і ў старэйшых у асноўным супадалі.

Але не-не, прабівалася ў маладзейшых спагадлівая іронія, жаданне «прызямліць» пафас, звесці непрыхаваны нервовы надрыў творцы да ўплыву бытавых праблем, падзей асабістага жыцця...

А ў гэты час па іншым канале з гарачым пафасам вядомыя «зоркі» шоу-бізнэсу змагаліся за правы геяў і лесбіянак. Якім толькі знішчальным эпітэтам яны не падвяргалі дэпутатаў Расійскай Дзярждумы, якія выступілі з ініцыятывай забараніць для дзяцей прапаганду нетрадыцыйнай сэксуальнай арыентацыі, і ўсіх тых, хто ў гэтай студыі даволі нясмела, з пэўнымі агаворкамі падтрымліваў гэтую ідэю!.. Здавалася, што самае важнае ў жыцці для іх — вось гэтая свабода адносін паміж аднаполымі каханкамі і далучэння да гэтага прасунутых разумных дзетак!..

Шчоўк — і заклапочаная Ксеня, дачка аднаго з былых лідараў дэмакратычнага руху васьмідзясятых-дзевяностых, паведамляе са скрухай гледачам, што не мела сексу чатыры месяцы...

Шчоўк — і сімпатычная вядучая пытаецца ў былой спартсменкі (а сёння мадэлі), ці праўда, што ёй прапанавалі аголенай зняцца ў фотасесіі для «Плэйбоя». І атрымаўшы станоўчы адказ, з непрыхаванай зайздрасцю ўдакладняе, як гэта адбывалася...

І ў гэтым моры «Ты не паверыш...», «Праграмы Максімус», розных «Муз ТБ» , «Рэн ТБ», баевікоў, мыльных опер і шмат чаго іншага асоба Уладзіміра Высоцкага выглядала нейкім недарэчным, выпадковым выключэннем сярод хваляў пошласці, гвалту, зубаскальства...

А чаго толькі не начытаешся ў інтэрнэце, якіх ракурсаў і поз не ўбачыш !..

І вось ужо на цябе глядзяць, як на ідыёта, калі ты пачынаеш заікацца пра любоў да Радзімы, пра мужнасць і рыцарства, вернасць і праўдзівасць, сумленнасць і сціпласць.

«Пасля Дубоўкі я б забараніла паэтам пісаць пра Радзіму», — піша ў рэцэнзіі на зборнік вершаў маладая крытыкеса.

«Можа, хіба толькі Максім Багдановіч варты ўвагі сярод гэтых сялянскіх класікаў», — вяшчае з-за мяжы модны ў вузкіх колах беларускамоўны празаік, аўтар зняважальных закідаў на адрас Янкі Купалы, Якуба Коласа, сумнавядомай эпіграмы на Янку Брыля. І тут жа дадае: «Добра, што Багдановіча своечасова з'елі сухоты, а то б напісаў усякай лухты пра мову, Радзіму, народ...»

— Гэта ў яго такая тонкая іронія, — запярэчыла мне аднойчы прыгожая і адукаваная выкладчыца айчыннай літаратуры.

А другая, не менш тонкая і адукаваная, усур'ёз заклапочана распаўсюджваннем неўнармаванай лексікі (а прасцей, — мата ) у літаратуры і жыцці.

«Новы час — новыя песні!?» Не выключаю.

Але ж ёсць пастулаты, якія праз тысячагоддзі захавалі сваё значэнне, былі крыніцай станаўлення асобы.

І здраднікі ва ўсе вякі былі здраднікамі, і пустадомкі былі пустадомкамі, і людажэры былі людажэрамі, і прадажныя дзеўкі не ўпадабляліся мадоннам, і «фортачнікі» не лічыліся Робін Гудамі...

Першыя ўрокі жыцця даюць кнігі і школа. І яшчэ двор, асяроддзе. Але двор таксама часта жыў па канонах, навеяных рамантычнымі кнігамі і фільмамі.

Сёння ж многія выхавальнікі захапіліся ўльтрасучаснымі, на іх погляд, гульнямі і мерапрыемствамі, песнямі і танцамі якіх заўгодна ўплываў, толькі не сваіх, родных.

І смешна, і сумна бывае глядзець, як размалёваныя і нафуфыраныя «па-даросламу» дзесяці-дванаццацігадовыя дзяўчынкі крыўляюцца, віхляюць бёдрамі, падражаючы чарговай аднадзёнцы-«зорцы», выкрыкваючы напісаныя ўвішным халтуршчыкам паўзразумелыя для іх словы.

А каму цікава, якія кніжкі ёсць у школьнай бібліятэцы, як праходзяць урокі роднай мовы і літаратуры, хто прыходзіць на сустрэчу з вучнямі, як яны бавяць вольны час?

І чаму нам часам не баліць, калі выпускнік сярэдняй школы не ведае, хто такія Мележ і Макаёнак, Танк і Куляшоў, Караткевіч і Быкаў...

Неяк неўпрыкмет мы губляем традыцыі выхаваўчай работы, спадзеючыся, што ў новым дэмакратычным грамадстве гэта анахранізм. Але ж ідэалогія, а папросту сістэма каштоўнасцяў, настоеная на традыцыях, менталітэце нацыі, патрэбна любому грамадству. Без гэтага яму цяжка будаваць сваю будучыню, захоўваць сваю ідэнтычнасць, самастойнасць.

Толькі што ў выдавецтве «Чатыры чвэрці» выйшла кніга прозы і публіцыстыкі старэйшага беларускага пісьменніка, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Алеся Савіцкага «Сонца на ўсіх адно». Гэта плён роздуму былога партызана і франтавіка, Ганаровага грамадзяніна Полацка пра мінулае і сённяшні дзень, пра сувязь пакаленняў і духоўны свет сучасніка.

У выдавецтве «Пачатковая школа» выдадзены кнігі « Полацк — бацька гарадоў беларускіх» і «Мінск — сталіца Беларусі» з серыі «Гарады і гістарычныя мясціны Беларусі» — багата ілюстраваныя, з мультымедыйнымі дадаткамі, пытаннямі для замацавання матэрыялу. У гэтым выдавецтве вытрымлівае трэцяе выданне кніга «Я грамадзянін Беларусі» — пра ўсё тое, што павінен ведаць школьнік пра сваю краіну, яе гісторыю і сённяшні дзень.

